Міхась Забэйда-Суміцкі



...ня думай, што мне ня хочацца
часта плакаць, але я, замест гэтага… сьпяваю!

# «Мужным мне нялёгка быць...»

***Лісты Міхася Забэйды-Суміцкага да Надзеі Батурыцкай***

***Маёй жонцы, Надзеі Вікеньцьеўне Батурыцкай, якая заўчасна памерла ў ліпені 2004 году, пашчасьціла працяглы час быць разам з Міхасём Іванавічам Забэйдам-Суміцкім. Успамінаецца далёкі 1965 год. У адзін з верасьнёўскіх дзён я і мае сябры праводзілі асьпірантку біялагічнага факультэту БДУ на стажыроўку ў Карлаў унівэрсітэт, што знаходзіцца ў Празе. Нашыя агульныя сябры Вячаслаў Райгойша і Лявон Акаловіч далі Надзеі адрас Міхася Іванавіча і невялічкія сувэніры. Уладкаваўшыся і крыху асвоіўшыся ў Празе, яна сустрэлася з Забэйдам-Суміцкім. Было гэта 8 лістапада 1965 году. З ліста Надзеі да мяне: “Пакладзены ў партфель “Жменя сонечных промняў”, “Лірычны вырай”, фотакартка, якую прынёс Лёнік, і беларускі “Мішка касалапы”. Мне дапамагаюць шукаць Polska, 12 ветлівыя пражане. Звычайны пад’езд, якіх многа ня толькі ў Празе. Кватэру дапамог знайсьці жыхар гэтага ж дому. І вось я перад дзьвярыма з шыльдачкай “Zabejda”. Даю магчымасьць сэрцу трохі адсту-***

*каццa. Цісну на кнопку званка. Ён такі, якім я яго ўяўляла, толькі крыху ніжэйшы. Пазнала бяз цяжкасьцей...*

*Першае, чаму я зьдзівілася, быў пакойчык. Маленькі, хоць і ўтульны, завалены нотамі, кнігамі, пісьмамі, часопісамі і [фотаздымкамі з] лепшымі людзьмі беларускай зямлі. Мініяцюрны раяль, вялікі радыёпрыёмнік, сервант і стол. Замест ложку канапа. Старая, як Прага, люстра, сьмешная лямпа. І ўсюды падарункі, узнагароды. Тут і вянкі з лентамі, і карціны яго вучняў, і бюст сьпевака, зроблены жонкай яго вучня, і букет старых кветак, і толькі ўчора падараваная лілея. Стол засялілі беларусы…*

*Між іншым, я засьпела яго за 10 нумарам "Полымя". Ён чытаў апошні раман Івана Мележа "Подых навальніцы"…*

*Мы доўга гутарылі. Аб усім. Я запытала: "Як Вы жывеце, Міхаіл Іванавіч?" Ён зьдзівіўся, быццам бы я запытала пра нешта немагчымае і незвычайнае, і адказаў: "Я не жыву. Я працую", – і паказаў на горы нотаў, кнігаў. Я не магла не паверыць, што сапраўды ён ні воднага разу ня мог быць задаволены сваімі канцэртамі, нягледзячы на бліскучае выкананьне і цеплыню падзяк. Перада мною быў вялікі мастак, працаўнік і вельмі просты чалавек, "pane professor", якому вучні носяць кветкі, а людзі, што слухаюць яго канцэрты, плачуць; які любіць Бацькаўшчыну вельмі добрай любоўю; чалавек мудры, разумны, культурны, які б вельмі шмат прынёс карысьці на Радзіме. Напярэдадні Забэйда-Суміцкі вярнуўся з гастрольнай паездкі ў Польшчу, адкуль прывёз "плiткі" з запісамі беларускіх і іспанскіх песень. Я папрасіла пракруціць. "З задавальненьнем", – ён паказаў, адкуль трэба чакаць голасу…*

*Ён засьпяваў "Калыханку", тую самую, што сьпяваў пасьля 20-ці гадовай разлукі з маткай, пасьля звароту з Італіі. (Між іншым, маці першы раз тады слухала яго. Цяпер ён пяе "Калыханку" ў кожным сваім канцэрце). Зноў-такі я не гавару аб выкананьні, вось толькі трэба сказаць, што я ніколі ня бачыла і ня чула столькі душы ў песьні, столькі нявыказанага смутку, столькі каханьня (не калыханьня!). Мне стала страшна і сумна, я не заўважыла, калі перастала з-за сьлёз бачыць рэпрадуктар.*

*"Плітка" спынілася. "Яшчэ раз?" – пытаецца Міхаіл Іванавіч. "Не, – адказваю, – ня трэба". Дзядзька Міхась не зьдзівіўся. Насупраць, ён вельмі звычайна сказаў: "Ты не адна, хто просіць аб гэтым"…*

*Мне пара ісьці. Ён дзякуе за вечар, за подых Менску, за гутарку, за кніжкі. Запрашае на свой канцэрт у пятніцу. А заўтра па запрашальнаму білету мы ідзем на канцэрт балгарскага хору. "Як жа я?" – запыталася. "Мне дазволілі ўзяць з сабой дачку", – быў адказ".*

*З гэтай першай сустрэчы і пачалася шчырая дружба Надзеі з Міхаілам Іванавічам. На працягу 9 месяцаў яны часта сустракаліся, кожны дзень Надзея тэлефанавала яму. Міхаіл Іванавіч браў яе на ўсе канцэнтныя паездкі ў Чэхіі, кожную нядзелю яны гулялі ў Рыгровым садзе, абедалі разам.*

*Пасьля вяртаньня Надзеі ў Менск у 1966 годзе паляцелі лісты з Прагі. Ліставаньне доўжылася 15 гадоў, аж да самых апошніх дзён Міхаіла Іванавіча. За гэты час Надзея атрымала 24 пашоўкі і 30 лістоў. Чытаючы іх, можна ўявіць тыя клопаты, якімі жыў гэты неардынарны чалавек.*

*Жыцьцёвыя абставіны не дазволілі Надзеі яшчэ раз пабываць у Міхаіла Іванавіча. Але ў 1998 годзе яна наведала Прагу, Альшанскія могілкі, і паклала на магілу Міхаіла Іванавіча жменьку беларускай зямлі.*

**Пётар РОГАч,**
**кандыдат геаграфічных навук, дацэнт.**

*Marianske Zazne. 18.8.1966.*

*"Адляцелі птушкі,*
*апусьцелі гнёзды…"*

Даражэнькая Надзейка!

Я так прызвычаіўся да Тваіх пражскіх тэлефонаў, што і цяпер, знаходзячыся ў Marianskych Zaznich, чакаю іх. Тым больш Табе дзякую за весткі аб сабе. Асабліва мяне парадавала Тваё пісьмо, з якога бачу, што Ты мяне зразумела больш, чым я спадзяваўся. Чытаючы яго, перажыў многа прыгожых, хвалюючых хвілін. Ты ж для

мяне была прадстаўніцай беларускай моладзі, на якую мы, старэйшыя, надзеемся, якой верым, якую любім і якой хочам перадаць усё лепшае, што ў сабе маем. Вы, маладыя, маеце школы з роднаю моваю. Мы іх ня мелі. Вы маеце самую дэмакратычную канстытуцыю, якая дае Вам вялікія мажлівасьці. Дык ажыцьцяўляйце іх!..

Ня буду многаслоўным. Чакаюць мяне розныя лячэбныя процэдуры. Моцна здало сэрца, а я хачу яшчэ жыць, каб пасьпяваць на Радзіме. Прыязджай, пагаворым. А пакуль што ўсіх Вас моцна абдымаю і цісну да сэрца.

Сардэчныя прывітаньні Тваім дарагім і блізкім і супольным сябрам шле

Міхась Забэйда.

*P. S.* Буду тут да 5 верасьня. Пісьмо ляціць 6 дзён.

*Прага, 26. 9. 1966.*

Давай трохі пагаворым, дарагая Надзейка!

Нашыя папярэднія пісьмы разьмінуліся, і таму я чакаў паведамленьня аб тым, што Ты атрымала матэр'ялы. Сёньня аб гэтым даведаўся. Трымаць іх можаш, колькі хочаш. Мо будзеш яшчэ што патрабаваць, напішы, калі што маю, прышлю. Але я думаю, што для Твае тэмы і гэтага хопіць. Алег Антонавіч вельмі задаволены, што Ты ўзялася гэта пісаць. А ён цябе добра знае. Апрача таго, маеш такіх добрых сяброў, як Пеця, Лёня, Слава, Алег А. і інш., якія Табе заўсёды шчыра парадзяць. Ды, апрача Цябе, мяне ніхто з нашых суродзічаў так доўга ня бачыў, ня чуў і "не вывучаў". Ну, і трэба ж памятаць, што за апошні час я таксама трохі вырас. Зразумела(,) я не такі, як ты пішаш у сваім першым (такім харошым!) пісьме да мяне. Але я стараюся быць такім.

Не магу зразумець Цішчанкі. Ён жа, каб сабраць аба мне больш матэр'ялаў, нават у Шэйпічы езьдзіў. Фатаграфаваў тыя хаты, дзе я жыў. Быў на магіле мае матулі. Начаваў у мае стрыечнае сястры Надзі. Што магло з ім стацца? Думаю, што матэр'ялы ён мае, але хоча іх выкарыстаць аж па маёй сьмерці. Ня варта аб гэтым гаварыць. Пастарайся абысьціся без яго, хоць ён мае унікальныя, як кажуць, матэр'ялы, якіх нават і я цяпер ужэ ня маю.

Вельмі мяне парадаваў сябра Алег.

"Помню: з маленскай,
Дзівоснай пары
Стрэчаў з табою
Шукаў на зары.

А пасталеў я,
Бяда, не бяда,
Ты мне патрэбны,
Як хлеб і вада."...

Апрача прыгажосьці, прысланы мне верш мае глыбіню. Прызнаюся, ні ад Цябе, ні ад яго не чакаў я столькі ўвагі да сябе, бо ведаю, як закручвае ўсіх "вір" сёньняшняга жыцьця. У многіх, хто са мной у жыцьці сустракаўся, былі добрыя намеры, і ніхто іх ня зьдзейсьніў. А я і ня крыўдзіўся, хоць было сумна... Перавернем старонку.

Канцэрт мой у Янскіх Лазьнях быў падобны да тых, якія Ты слухала. Вельмі ўсім спадабалася наша калыханка. Шкадаваў, што Ты ня чуеш, але са мною было Тваё пісьмо. Між іншым, калі памятаеш свае думкі і пачуцьці ў ём выказаныя, дык гэта амаль тое самае, што думаю і перажываю я.

Месца Тваё ў самаходзе пуставала, а дарогай, як мала калі, можна было любавацца. Быў цудоўны, сонечны дзень...

Амаль не забыўся падзякаваць за падарункі: кніжку, мядок і гарэхі, якія мне перадала Тамара. (Яна ўсё езьдзіць. Цяпер у Брацілаве.) Дык шчыра дзякую! Гарэшкі трэба было зьесьці самім, бо "фанатыку сьпеву" іх есьці ня можна (але я ўсё-такі іх зьеў!..)

Здароўе маё, пакуль што, пазваляе працаваць. А гэта для мяне галоўнае. Думаю,

што вясной змог бы засьпяваць для нашай моладзі ў Менску. Без ганарару! Тады ня трэба прасіць у Масквы дазвол. (Як гэта было ў Брацiславе.) Падумайце аб гэтым. Можаце ўвайці ў кантакт і з пісьменьнікамі.

Мяне вельмі цікавіць Сав. Канстытуцыя. Калісьці яе вывучаў. Але цяпер напэўна яна здасканалена. Калі знойдзеш, прышлі. Прачытаю і вярну назад.

Абдымаю і цалую ўсіх, хто актыўна любіць нашу родную песьню. Дзядзька Міхась.

*Заўв. на палёх:* Вельмі пагана піша пяро (кітайскае!..)

*Прага, 15. 10. 1966.*

Дарагая Надзейка!

Дзякуй за пісьмо з датай 4-га г. м., якое я атрымаў толькі сягоньня 15 г. м. Мусіць, Ты доўга яго насіла, пакуль адправіла. А я ўсё чакаў яго.

Прыемна чытаць Твае мілыя словы. Не лічы толькі, калі ласка, што Ты мне за нешта ўдзячная. Я ж найшоў у цябе зразуменьне (аб чым ужо пісаў) і маральную падтрымку, а для мяне, адзінокага, гэта было варта больш за ўсё. "Ішоў я самотны, шляхам цярністым" і ня раз прыходзілі сумныя думкі, ці было гэта патрэбна? Ты адганяла гэтыя сумнівы, вяртала мяне, як цяпер зноў бачу, да добрае, карыснае для нашага народу, працы, якая ўзбагачае і сусьветную культуру. І толькі "цьвердалобыя" (як піша Танк) ня бачаць гэтага, ці мо ня хочуць бачыць. Не бяда: прыдзе час – будуць мусіць убачыць, бо мая праца астанецца ў Вас, маладых, а Вы перажывяце "цьвердалобых", як перажылі ўжо мы "культ"…

Хацелася б толькі, каб Ты ня плакала (нават ад шчасьця), бо сьлёзы забіраюць у нас многа энергіі, якую лепш патраціць на нешта іншае.

Ня буду пісаць многа. На ўсякі выпадак пасылаю Табе крытыку з беларускай газеты, якую піша нейкі "Мэлёман". Гэта, бадай, адзіная беларуская крытыка, з якое відаць, што той, хто піша, разумее вакальнае мастацтва і ўмее аб гэтым напісаць. А гэта ў нас, пакуль што, ня часта бывае.

Дык да пабачэньня!

Абдымаю Цябе і ўсіх Тваіх добрых сяброў. Твой дзядзька Міхась З.

*Прага, 15. XI. 1966.*

Дарагая Надзейка!

У сувязі з тым, што заўтра пачынаецца маё змаганьне, ці барацьба, – серыя канцэртных выступленьняў, – пішу Табе, бо, як заўсёды, і гэтым разам ня ўпэўнены, ці адно з гэтых выступленьняў ня будзе апошнім. Шэсьць канцэртаў. Кожны ў іншым месцы. А дарога мяне мучыць больш, чым сам сьпеў. Але вярнуся да Твайго пісьма з "10 кастрычніка", якое атрымаў сёньня. Ужо тое, што лістапад ты называеш кастрычнікам, гаворыць, як ты стомлена і заматалася. Робіць гэта "атамавы" век, у які жывем. Ці выздаравеў ужо твой брат? Як цяжка ляжаць у бальніцы, добра ведаю, бо быў там даўжэйшы час. А крэўных нікога!..

Я ўжо табе пісаў, што ня маеш перада мною ніякага доўгу. Маем доўг супольны: перад Радзімай. Асабліва Твае праціўнікі ў дыскусіях. Але яны гэтага "не разумеюць", бо на іх баку карысьць эканамічная, якое яны трымаюцца. Аб гэтым яшчэ Гётэ пісаў: "На земле весь род людской чтит один кумир священный. Он царит над всей вселенной. Тот кумир телец златой…" (Мефістофель у "Фаўсьце"). На жаль, яшчэ шмат на сьвеце людзей, для якіх "телец златой" важней за ўсё. Калі гэта сабе ўсьведамляю, бывае вельмі сумна. А цяпер асабліва. Ты ведаеш мой настрой перад канцэртамі. Успамінаецца аповесьць. У баі цяжка ранены салдат. Калі, пасьля бою, яго падбіралі, ён адчыніў вочы і запытаўся, чыя перамога. Яму сказалі: "Наша". – "Значыць, магу ўмерці", – прашаптаў салдат і заплюшчыў вочы назаўсёды…

Ці абвяшчалі, хто сьпяваў "Сароку" і "Свадзьбу", ці ты толькі здагадалася?

Плытак маіх у Менску ёсьць столькі, што могуць рабіць цэлыя канцэрты, але трэба, каб аб гэтым зьвярталіся да радыё з жаданьнем (падкрэсьл.). Шкада, што і на гэта патрэбны час. А сёньня ніхто ня мае часу даволі нават для сябе. І ты, дарагая Надзейка, не змушай сябе да пісаньня доўгіх пісьмаў. Я ж добра разумею, што ты круцішся, як "белка в колесе". Хопіць мне пару радкоў, што жывеш, памятаеш. Што сад разводзіць усё ж трэба, хоць яблыкаў з яго не дачакаюся…

Ці не казаў Юзьвюк, калі будуць плыткі? Мне яны нічога ня пішуць, а я ж павінен быў бы скантраляваць, ці не зрабілі там пры друкаваньні якое памылкі. Не навучыліся ў нас яшчэ як сьлед працаваць. Ня ведаю, ці Табе пісаў, што ў Амерыцы перадрукавалі мае перадваенныя пласьцінкі са старых пашкоджаных пласьцінак… Да нічога лепшага не дадумаліся… Ох, бяда ты наша!

Крытыку [ў] "Сьвята мастацтва" паслаў толькі для таго, каб паказаць, што і ў нас ёсьць людзі, якія разумеюць песьні і ўмеюць аб гэтым гаварыць. Цытаваць яе ня мусіш. Яна з "Беларускае газэты" № 75. 11.X.1942. Менск. Каб ты ня траціла час на пераклад, адшукаў для цябе артыкул доктара Д. Фікрле, надрукаваны ў "Ніве" № 51. – 19.XII.65. Беласток.

Канчаю пажаданьнем добрага здароўя, посьпеху ў працы, многа шчасьця Маладой Беларусі. Абдымаю Вас усіх і цалую.

Ваш дзядзька Міхась Забэйда.

*P. S.* Дзякуй за паклон Хлопцам і лабараторыі.

*Прага, 27-XI-66.*

*"У думках заўсёды з Табой,*
*маладая мая Беларусь".*

Дарагая Надзейка!

Вярнуўся я з канцэртнага падарожжа жывы і цэлы. А магло быць і іначай. Даезд (дарога) быў вельмі трудны. І холад, і спалучэньне кепскае, і кажды раз доўга ехаць. Але выступленьні былі вельмі пасьпяховымі (ды Ты іх ведаеш). А было іх ужо 5. А 2-га сьнежня будзе шостае, у гэтым годзе апошняе. У Багданчы. Успамінаеш? З Карлавай студанкі паслаў Табе паштоўку. Па дарозе ў Есенік аўтамабіль "пасьлізнуўся", і мы ледзь-ледзь не паляцелі "на той сьвет". Такога труднага падарожжа яшчэ ня меў. Ну, а калі вытрымаў, дык буду жыць аж… да сьмерці…

У Празе знайшоў Тваё пісьмо. Прыемна чытаць пра Твой энтузіязм да беларускае песьні, яшчэ прыемней было б Цябе ў гэты час бачыць, асабліва калі б Ты "не ўтрымалася", як пішаш. З Твайго пісьма не відаць, ці на вечары паказвалі мае фотаздымкі, ці Ты проста мяне "ўяўляла"? Што чула з беларускае паэзіі?

Хацелася Табе многа напісаць, прачытаўшы Тваё прыгожае пісьмо, але бачу, што Ты і так разумееш, і нават адчуваеш, як я. Дык лепш "гусей і не дражніць", як кажуць.

Ня ведаў, што Рыгор Раманавіч стаў кампазітарам, бо іначай хіба было б трудна быць старшынёй праўленьня Саюза кампазітараў. Яго "ўсё глядзяць" нагадвае мне прыказку: "напалоханая варона і куста баіцца". І не дзіўлюся, ведаючы, колькі лепшых нашых людзей загінула ў часе культу. Прача таго, трэба памятаць, што і "прэміі" таксама забавязваюць… Мне усё ж здаецца, што гэта добра, што "ўсё глядзяць". Горш, калі, ня гледзячы, слухаюць даносаў. А калі сапраўды глядзяць, дык зразумеюць, што наша песьня нікому ня можа шкодзіць. Наадварот, — яна абагачае ня толькі наш народ, але і сусьветную культуру. Але аб гэтых рэчах лепш гаварыць, чым пісаць. Дык буду "мацавацца", як мне радзіш Ты з сябрамі беларускае песьні. Буду разводзіць сад, калі ёсьць надзея, што Вы, маладыя, яго патрабуеце, з яго скарыстаеце, а пры гэтым мо і мяне ўспомніце добрым словам.

Ад'яжджаючы на даўжэйшае падарожжа, папрасіў сваю гаспадыню, каб у дзень майго прыезду запаліла ў печы ў маім пакоі, а яна не сумела адчыніць дзьверцы, дык вырвала

іх зусім з печкі. Цяпер чакаю печніка, каб паправіў гэту бяду. Вось маё жыццё адзінокае!.. Але бывае яшчэ горш… Трэба гэта памятаць і тагды бывае лягчэй усё пераносіць.

Канчаю, бо яшчэ моцна стомлены. Пішу толькі таму, каб даць ведаць Вам, маім дарагім сябрам, ці, лепш кажучы, сябрам нашае роднае песьні, што яшчэ жыву і, калі паклічуць, засьпяваю Вам гэтую гэту песьню, абдымаю Вас усіх і цалую.

Ваш дзядзька Міхась Забэйда.

*Прага, 8. 12. 66.*

Дарагая Надзейка!

Атрымаў Тваё пісьмо ад 21 лістапада. Яго радкі і радуюць, і засмучаюць. Няможна так моцна рэагаваць на сумныя зьявы жыцьця, бо “згарыш” раней, чым зможаш нешта добрае зрабіць. І таму маю да Цябе адну просьбу: ня плач, калі ласка, нават ад шчасьця. Плач страшэнна аслабляе чалавека, пазбаўляе яго энергіі, так патрэбная для дзейнічаньня, для чыну. Ня думай, што мне ня хочацца часта плакаць, але я, замест гэтага… сьпяваю! Ці ж гэта ня лепш? Дык абяцаеш ня плакаць?

Мой канцэрт у Багданчы быў вельмі пасьпяховы. Было поўна людзей. І primar быў. (Шкада, што не было цябе!) і міжволі ўспомніўся канцэрт Далуханавай, якая два дні раней сьпявала ў доме ўмельцаў. Сьпявала цудоўна, але зала была напалавіну пустая. Шкада. У Багданэч запрошаны зноў на сакавік, а ў Есенік на травень. Прыязджай. Паслухаем.

Цікавую думку пачуў нядаўна ў нашым радыё: калі хочуць абезгаловіць народ, дык стараюцца зьнішчыць яго інтэлігенцыю. Тут я ўспомніў адносіны да беларускай інтэлігенцыі за царызмам і ў пару культу… Далей успомніў словы б. чэхаславацкага прэзідэнта Запатоцкага: “Самая дэмакратычная сістэма праўленьня сама ня робіць нічога. Рабіць мусяць людзі”. Вось гэта трэба памятаць заўсёды, хочучы дажыць да лепшага, прыгажэйшага, шчасьлівейшага жыцьця. Аб гэтым думаю, чытаючы савецкую канстытуцыю, якую дастаў у славянскай кнігоўні. Праўду кажа Барадулін: “Беларусь, не маўчы, не прасьпі сваё шчасьце!” Беларусы, мусіць, самы “санлівы” і маўклівы народ між славянамі. Маю ўражаньне, што шмат хто з іх нават ня ведае, якія мажлівасьці ім дае канстытуцыя. Караткевічава фраза: “Прабач, мы цябе дарэмна мучылі” гаворыць аб тым, што ў наш век вельмі часта бывае.

Я, між іншым, не фанатык мастацтва, але “фанатык”, каб мастацтва як найлепш служыла чалавеку, каб рабіла яго лепшым, а жыцьцё прыгажэйшым, шчасьлівейшым, каб зьбліжала людзей, вяло да міру.

Даруючы свае пласьцінкі Менску, нават некаторыя апошнія экземпляры, спадзяваўся, што Радзіма зможа зрабіць са мною пліткі новыя, лепшыя. На жаль (на вялікі жаль!), гэта ня сталася. Радзіма не змаглася… І таму трэба, пакуль пліткі яшчэ ня вельмі пашкоджаныя, пераразьняць іх на магнітафонную стужку і перадаць у дзяржаўны мастацкі архіў, каб з мае працы, якой прысьвяціў усё сваё нялёгкае жыцьцё, маглі карыстацца як найдаўжэй. Хочацца верыць, што знойдуцца такія энтузіясты беларускай песьні, якія гэта зробяць (і добра зробяць!).

І на заканчэньне нешта радаснае: і ў гэтым годзе атрымаў ад Фонду чэхаславацкіх кампазітараў прэмію за майстэрскае выкананьне іх сучасных песень.

Дабранач, даражэнькая Надзейка, прадстаўніца беларускай моладзі. Абдымаю Вас усіх і цалую. Дзядзька Міхась.

*Прага, 17. І. 67.*

Дарагая Надзейка!

Сёньня атрымаў Тваё пісьмо (ад 10/І г. г.). Дзякуй за мілыя пачуцьці ў ім выказаныя. Пісаў Табе за апошні месяц тры разы, а ад Цябе атрымаў, апрача сёньняшняга, толькі віншаваньне, дык чакаў, як будзеш рэагаваць на пэўныя пытаньні, закранутыя ў пісьмах. Але бачу, што і Ты ня маеш часу на адказы, як гэта ў наш час вядзецца агулам. Шырма ўжо на два пісьмы не адпісаў. Танк напісаў шчыра,

што можа пісаць толькі, калі ляжыць у бальніцы. я гэта вельмі добра разумею і ня турбую іх. Шкада толькі, што і ў зьдзяйсьненьні сваіх мастацкіх намераў не магу спадзявацца на іх падтрымку. А з гэтым зьвязана і тое, пачуеш Ты мяне ці не. Гэта ж залежыць ад Вас, ад Менску. А я бачу, што ў Вас і свае працы больш чым трэба. Што зрабіць? Трэба неяк жыць, як Ты пішаш, ажаніўшы Валодзю. (Пажадай яму ад мяне многа-многа шчасьця).

Я ўжо Табе пісаў, што насьпяваў у лістападзе м. г. новую італьянскую плітку. Цяпер хачу насьпяваць на пласьцінку 10-12 беларускіх песень (рамансаў), як "Вечар" ці "Ты прыдзі", якія Ты чула і інш. На жаль, гэта зьвязана з умовай купіць 500-600 пласьцінак.

Сав. Саюз кожны год купляе ў ЧССР каля 200000 розных пласьцінак. Калі ў гэту колькасьць уключаць 600 пласьцінак беларускіх, тады змагу насьпяваць беларускія песьні. Як бачыш, мая праца тут залежыць ад таго, ці Беларусь зможа замовіць тут гэтыя пласьціні.

Ніл Гілевіч пісаў, што мяне стараюцца перацягнуць у Менск. Было б лепш, каб стараліся выкарыстаць мяне ці для канцэртаў, ці, як пішу, для плітак. Гэта значна лягчэй, але баюся, што і з гэтага нічога ня будзе.

Тут я ўздыхнуў. Прыпомніўся мне Барадулін: "Беларусь, не прасьпі сваё шчасьце"… Ня ўмеем мы працаваць!.. Не дзіўлюся ўжо, што аба мне напісалі: "Чалавек-легенда". І далей буду рабіць што змагу, нягледзячы на тое, ці будзе хто памагаць ці не.

Ня ведаю, ці Табе пісаў, што ў Амерыцы выдалі без мае згоды мае даваенныя беларускія пласьцінкі. Перапісалі са старых ужо папсаваных. Да нічога лепшага не дадумаліся!..

Тамару бачу вельмі рэдка. Нядаўна з Нінай перадалі Твае "зефіркі". Дзякуй, але аб гэтых рэчах не турбуйся: тут усяго даволі. Не хвалюйся, калі ласка, дарагая Надзейка, калі, не атрымаўшы пісьма ад Цябе, ня буду пісаць сам. Са мною нічога ня можа быць. А калі б, прыпадкам, памёр (хоць і не зьбіраўся) дык абавязкова паведамлю Табе.

Абдымаю і цалую ўсіх Вас – маладых, нашу надзею, нашу зьмену!

Да пабачэньня! Дзядзька Міхась.

*Прага, 8. 4. 67.*

Дарагая Надзейка!

Нарэшце атрымаў ад Цябе вестку. Шчыра дзякую. Адчуваў, што з Табою не зусім добра.

Вясной усе чульлівыя людзі (асабліва перачуленыя) перажываюць дэпрэсію. 14 год таму прыгнечанасьць (дэпрэсія) у мяне была такая, што я ледзь-ледзь утрымаўся, каб не пакончыць з сабой. Добра, што вытрымаў: змог зрабіць новыя плиткі, з якіх людзі маюць радасьць.

Найлепшы лек ад прыгнечанасьці, гэта перамагчы сябе (хоць і ня хочацца) і рабіць нешта канкрэтнае, добрае. Між іншым, ува мне прыгнечанасьць астаецца нават тады, калі я сьпяваю і вясёлыя песьні, як "Лявоніха", але я стараюся гэтага не паказваць. Іншая справа, калі я застаюся адзін. Тады бывае горш. Чалавек, які хоча нешта зрабіць і ня можа, або не пасьпявае, ня будзе сабой задаволены ніколі.

Не бываю задаволены, зразумела, і я, нават пасьля самых пасьпяховых выступленьняў, бо ведаю, што яны маглі б быць лепшымі і даць людзям больш у іншых умовах.

Прыемна, што Рыгор Раманавіч выкарыстоўвае падараваныя яму пласьцінкі. Было б добра падзякаваць яму за гэта ад імя слухачоў. Каб ён ведаў, што гэтым робіць людзям радасьць.

Канцэрты мае, аб якіх пісаў раней, прайшлі, як звычайна, пасьпяхова, але я ня быў пэўны, што "ня кончуся" раней, чым прыйдзе канец выступленьня.

Цяпер гатоўлюся да новых: 4-га траўня сьпяваю (маю сьпяваць?) у Есеніку, 5 – Дольна Ліпова, 2-га чэрвеня знаёмы табе Богданеч. (Там хочуць "аславіць" мае нарадзіны). Прыяжджай і Ты. Будзе лягчэй сьпяваць. Паможаш падганяць сэрца. А то яно вось-вось ды затрымаецца (нават і цяпер гэта робіць, дурное!..)

Ну але цяпер я ўжо не адзін: прыляцелі "мае" шпакі. Кажны дзень шукаю іх у Рыгровых садах, дзе цьвітуць forzicii і macesky (браткі) і разам са мной шлюць Табе і ўсім, хто любіць нашую песьню, нашую мову, Радзіму, самыя шчырыя, самыя сардэчныя прывітаньні.

Дзядзька Міхась.

*Заўв. на палёх:*

*P.S.* Старэйшыя ня маюць часу. Малодшыя ня маюць сілы. І мусіць так яно пацягнецца ўжо да самае магілы…

*P.P.S.* Шкада, што нікому не перадаў свае "гены".

*Прага, 8. 6. 1967.*

Дарагая Надзейка!

Бяру прыклад з Цябе і адразу адказваю на Тваё доўгачаканае пісьмо. Шчыра дзякую за мілыя, прыгожыя словы, за добрыя пачуцьці, якія там знайшоў.

Прыйдзецца згадзіцца з Табою, што я "паэт", бо больш непрактычнага чалавека, чым я, здаецца, трудна знайсьці. Яшчэ ў Італіі мой прафесар казаў мне: "Я маю вучняў, якія свой талент, варты ня больш 50 лір, прададуць за 150, а вы маеце таленту на 150, а не прадасьцё яго і за 50 лір…" Меў праўду. Я гэта ведаю і часамі дзіўлюся, што дагэтуль яшчэ не загінуў. Мусіць Матка аберагае…

Шкада, што на "юбілеі" "і пець, і піць, і закусваць, і музыку слухаць" буду без цябе. Запрашаючы ў госьці, зразумела, матэр'яльную старонку браў на сябе. А вось з дысертацыяй трудней: тут памагчы я не магу, хоць з вялікім зацікаўленьнем слухаю ў нашым радыё лекцыі: "Біялогія 1967". Слухаю і ўспамінаю…

Перад канцэртам у Багданчы раптам захварэў. Тэмпература 39! Прышлося клікаць доктара. Памог пеніцылін. Але слабы дагэтуль. Канцэрт усё ж прайшоў з вялікім посьпехам. Дзіўлюся, адкуль узяліся сілы. Сьпяваў амаль 2 гадзіны без перапынку. Пасьля нашай калыханкі шмат у каго былі мокрыя вочы. Шкадаваў, што не было прадстаўніцы беларускай моладзі, якая калісьці так прыгожа падзякавала за песьні.

Добра, што на Радзіме хоць з плітак пачуюць нашыя песьні: яны вартыя гэтага. З друку даведаўся, што і ў Амерыцы зрабілі такі канцэрт. Шкада, што дагэтуль ня маю адказу з Менску на прапанову зрабіць плітку бларускіх песень-рамансаў. Гэта мяне моцна засмучае. Траціцца час. Жыцьцё скарочваецца. Хоць мяне і называюць фізіялагічным феноменам, але "феномен" не жыве вечна. А хацелася б яшчэ нешта добрае зрабіць.

Пытаешся, ці хопіць сілы на барацьбу, якая мне яшчэ прадстаіць у будучым? Ня ведаю, што Ты пры гэтым маеш на ўвазе (што думаеш). Сьпяваць яшчэ магу добра, пра іншае ня ведаю.

Дзякуй Табе і хлопцам – Пецю, Славу, Лёню і Ваню, што часамі ўспамінаеце. Пішы часьцей, не чакаючы добрага настрою. У наш век ён ня часта бывае.

Шлю ўсім Вам шчырыя прывітаньні. Заўсёды Ваш

дзядзька Міхась.

*Прага, 21. X. 67.*

Дарагая Надзейка!

Захацелася напісаць Табе пару радкоў, а тут якраз атрымаў і Тваё пісьмо (адказ на маё папярэдняе), ну дык можам і пагаварыць. Перш за ўсё, хачу ведаць, калі Ты падорыш сьвету новую Надзейку, ці новага Пецю? Буду трымаць Табе палец (як

тут кажуць) на шчасьце. Тым больш, што пра мяне наогул гавораць, што прыношу шчасьце, дык хай жа гэта будзе праўдай у адносінах да Цябе. Хочаш?

Ну а далей пару слоў пра сябе. Пачаў сезон у Крэматорыі. Над знаёмымі сьпяваць бывае цяжка, але адказацца ў такую хвіліну бывае трудна. Потым выступаў у доме пенсіянераў у Плзні. Сярэдні век іх быў 75 год, а аднаму было 92(!). Па канцэрце ўсе дзякавалі…

Пасьля нашай калыханкі шмат хто выціраў вочы. Цяпер гатоўлюся да 7 і 8 лістападу. Сьпяваю ў Велькіх Ласінах і ў Карлавай Студанцы. Дарога далёкая, самаходам. Прыяжджай, паедзем разам!

Як бачыш, у маім жыцьці, пакуль што, нічога не зьмянілася, калі ня браць пад увагу сэрца, якое ўсё больш і больш дакучае. Стараюся не зьвяртаць на яго ўвагі. Хай “скача”, пакуль можа.

З Тваіх знаёмых ня бачыў нікога, бо ім няма ніякае карысьці падтрымліваць са мною сувязі.

Сяргею Грахоўскаму паказваў працу. Было цудоўнае надвор’е. Сонца, цяпло… Адразу па прыезьдзе ў Менск напісаў мне вельмі прыгожае пісьмо. Вось пару радкоў з пісьма. “Жыву пад уражаньнем нашых сустрэч, душа сагрэта Вашым сьвятлом, шчырасьцю і дабратою. Успамінаю штодзённа ўсе драбніцы нашых вандраваньняў па Празе. Усе, каго сустракаю, распытваюць пра Вас, і ў кожнага адно пытаньне: “Калі прыедзе?”…

Адным словам, такое захапленьне, што мне аж няёмка. Я ж для яго нічога асаблівага не зрабіў. Праіграў свае пласьцінкі. Прайшліся па Празе, пагаварылі.

Мяне часта людзі бачаць і адчуваюць такім, якім я хацеў бы быць, але да гэтага яшчэ далёка. “І на сонцы ёсьць плямы”.

Прыслаў мне “ЛіМ”, “Кругазор”, кніжку “Пра час і пра сябе” і напісаў ужэ другое пісьмо. Вось малайчына. Хацеў бы я мець яго энергію.

За радыёперадачу дзякую. Мой магнітафон – Grundig TK 20, скорасьць 9. Але не рабіце сабе клопату з перасылкай стужкі, хоць паслухаць было б прыемна. Лепш пасьвяціць свой час (якога маеце мала) і ўвагу таму, каб была замоўлена пласьцінка. Ня шкодзіла б пашырыць і ранейшыя з народнымі песьнямі. Гэта ж каштоўнасьць, якая ніколі ня страціць свае цаны (нават калі ня будзе беларусаў).

Пры аказіі падзякуй Д. Жураўлёву за кніжку «Композиторы Советской Белоруссии». (Пакуль што там вельмі мала беларусаў).

У замоўленьні маіх плітак мусяць жа быць зацікаўлены і Саюз кампазітараў, і Саюз пісьменьнікаў. Але аб гэтым я ўжо Табе пісаў. І Грахоўскі абяцаў зрабіць усё магчымае, каб пліткі былі замоўлены.

Калі такая простая рэч так цяжка даецца, дык што гаварыць аб пераезьдзе чалавека (з рэчамі!)? Увесь час гавару аб тым, каб арганізавалі канцэрты, гэта прасьцей, а мо і карысьней. А між тым страчана ўжо 5 гадоў. Ды ўжо ж і ад Твайго ад’езду з Прагі ідзе другі год. Праўда што «вышэй галавы і конь ня дзягне», як казала мая мама.

Прачытаў «Мёртвым не баліць» Васіля Быкава («Маладосць» 7-ы і 8-ы №). Моцна напісана. Прачытай. Пераведзена і на чэшскую мову.

Пра Т. Рабушкіну ня чуў нічога. Роза ні радка не напісала.

Ну, вось і пагутарылі. Як бачыш, трымаюся. Трымайся і Ты, дарагая Надзейка, перад «размнажэньнем». Гэта трудней, чым сьпяваць. Але не хвалюйся. Усё будзе добра. Усё мусіць быць добра.

Абдымаю і цалую ўсіх прыхільнікаў нашае роднае песьні.

Дзядзька Міхась.

*P.S.*

Прышла і ў сад Рыгровы восень,
і смутак мы ўжо ў сэрцы носім.

Яно цяпла і сонца просіць,
а восень холад, дождж прыносіць.

Мяне часамі мужным называюць.
Яны ня ведаюць, што свае сэрца
я на прывязі трымаю.
Яно трапечацца, як птушка ў клетцы.
Бо сіратою рос.
І ў ім даўно, з маленства,
страх і крыўда
гняздо сабе зьвілі.
І мужным мне нялёгка быць.
Ды прызнавацца ў гэтым цяжка,
нават сабе самому…

*Praha, 12. 6. 68.*

Дарагая Надзейка!

Шкада, што я далёка. Толькі таму, зразумела, ты кладзеш перада мною сваю "пакорную" галаву і дазваляеш рабіць з ёю, што я хачу. Іначай, мусіць, было б, каб я быў блізка.

Як бачыш, не злуюся. Інфарктныя людзі, як вядома, злавацца не павінны: гэта ім шкодзіць. А хто хоча сабе шкодзіць? На надыходзячы канец гляджу спакойна. Не хацеў бы толькі, каб з гэтым фізічным канцом, які чакае ўсё жывое, загінула і мая мастацкая праца (на карысьць Радзімы), якой прысьвяціў амаль усё жыцьцё. М*а*ю на ўвазе нашы песьні. Пакуль я жыву, яны гучаць. Трэба, каб яны гучалі і тады, калі мяне ня будзе. Заказ на насьпяваныя тут пласьцінку ўсё яшчэ ня зроблены. Ад Вас, суродзічаў, залежыць, ці гэта зьдзейсьніцца.

Што гатовіцца перадача беларускае песьні на Маскву, гэта вельмі добра. Але ня трэба забывацца пра заказ. Ды ня проста памятаць пра гэта, але трэба нешта рабіць. (Лепш пакуль я жыву… Можа, у чым памог бы).

Я ўсё яшчэ "саджу сад", як бачыш з прыложанае абвесткі. Між іншым сьпяваў там песьню, якую першы раз выконваў у Варшаве 30 год таму назад. Па канцэрце падышоў да мяне прафесар Прыходзька, абняў, пацалаваў і сказаў, што сьпяваў я лепш, чым 20 год таму. Яму ўжо 80 год, і ведае ён мяне ад першых выступаў у Празе.

Пісьмо Гіля патрабаваў не для сябе. Быў тут пісьменьнік з Менску, які хацеў бачыць гэта пісьмо. Шкада, што ты яго не прыслала, калі цябе прасіў аб гэтым. Але ўсё гэта дробязі перад тым "вялікім", што чакае кожнага чалавека.

Ці мае суродзічы калі "разварушацца", – невядома. За маё жыцьцё, мусіць, не. Такое ўражаньне маю ад тэлефоннай размовы з праф. Жыдліцкім, які прывёз мне прывітаньне з Менску.

Канчаючы, дзякую Табе, дарагая Надзейка, за мілыя словы, за сяброўскія прывітаньні і шлю Табе і тваім мужчынам гарачыя прывітаньні ў "канцы" свайго 69 –

Ваш дзядзька Міхась.

*P.S.* Не цягні вельмі доўга з адказам: будзе шкада, калі не змагу прачытаць тваіх добрых слоў. Усё мае свой канец…

*Прага, 18.6.71.*

Даражэнькая Надзейка!

Вельмі мяне парадавалі твае добрыя словы да маіх 71-х народзін. Адказваю адразу, бо пісьмы ходзяць марудна.

Бачу, што турбот у цябе больш, чым трэба. А чаму хварэе сын? Маё здароўе памаленьку пагоршваецца. І так дзіўлюся, што дагэтуль жыву. "Ни кола, ни двора. Зипун весь пожиток. Эй, живи, не тужи! Умрешь – не убыток", — успамінаецца верш са школьных гадоў. Жыву і нават сьпяваю (калі ёсьць дзе). За 31 год працы ў Празе насьпяваў у радыё многа песень розных народаў. Прыемна было думаць, што і па

сьмерці буду даваць людзям радасьць, хоць з радыёвых магнітафонных наіграньняў. Але прыйшоў шэсьдзесят восьмы год і ўсе мае наіграньні сьцёрлі. Там было многа песень савецкіх кампазітараў… Як бачыш, настроі ў людзей мяняюцца.

Праўда, было б добра, каб цябе “занесла” ў Прагу. Але надзеі на гэта мала, а я ўжо нікуды не паеду. Пасьля другога інфаркту хадзіць магу толькі памалу. Аслабела сэрца. Аслабела сэрца (ня мае бензіну).

Дзякуй, што пазваніла Рыгору Раманавічу. Кнігу напісаць яму будзе трудна. Ён жа старэйшы за мяне, ды і завалены працай.

Адна вестка мяне моцна засмуціла: памёрла мая стрыечная сястра Надзя. Гэта быў апошні чалавек, хто мяне знаў з маленства. Было ж нас у дзьвюх сем'ях 17 асоб. І вось астаўся толькі я адзін. Памерці не баюся, – шкада толькі, што так мала ўдалося зрабіць для Радзімы. Быў тут літоўскі ансамбль песьні і танца. Меў вялікі, заслужаны посьпех. (Шкада, што нашы не былі тут ні разу).

Надвор'е ў нас вельмі непрыемнае: дождж і холад. Для сардэчнікаў гэта вельмі кепска. Канчаю, бо пабольвае сэрца. З падзякай, што ўспомніла, шлю Табе і Тваім блізкім самыя лепшыя пажаданьні і сардэчныя прывітаньні. Калі зможаш, пішы. Твой дзядзька Міхась (які з радасьцю з табой пабачыўся б!).

*20. IX. 71 г.*

Даражэнькая Надзейка!

Вялікае табе дзякуй за пісьмо з унукам і яго маткай, за добрыя словы, за гутарку наогул. Прышло ўсё гэта якраз тады, калі вельмі балюча адчуваў адзіноту…

А Васілёк твой малайчына! Вось выхавай з яго добрага пісьменьніка, тады і запіскі твае ён зможа выкарыстаць. На фота ты зусім не зьмянілася, яшчэ нават пахарашэла. Шкада, што ня ўгледжу арыгінала.

Жыву, як і раней. Той жа пакойчык, раяль, ноты, кнігі, пласьцінкі. Толькі ў гаспадара менш сілы. Але яшчэ сьпяваю. У ліпені меў адзін з найлепшых канцэртаў у Лугачовіцах. Урач, які мяне чуў амаль перад 20 гадамі, пытаўся, як гэта раблю, што чым далей, тым лепш сьпяваю. Быў удалы вечар.

У Багданчы сьпяваў 3-га верасьня. І тут быў посьпех, але я нейк дзіўна адчуваў сябе. Здавалася, што вось-вось упаду. Як быццам быў напалову без сьвядомасьці. Цікава, што ніхто гэтага не заўважаў. Памагло тое, што быў, як заўсёды, вельмі добра падрыхтаваны. Усё ішло добра, але нейк “без мяне”… Мусіць, падкрадвалася “мяртвіца” (параліч). “Memento mori!..” Зьнішчаных у радыё стужак ужо ня вернеш. Там жа было 30 год працы. Сьпяваць я мог бы, ды ім гэта “не патрэбна”. Іншы настрой. У свой час пісаў у Менск, каб выкарысталі пражскія мае наіграньні, ды не зьвярнулі на гэта ўвагі. Хацеў бы паслаць табе сваю апошнюю доўгаіграючую плітку, каб магла з хлопцамі паслухаць. Але ў паштовую скрынку яна хіба ня ўлезе? На які адрас маю паслаць? Не цягні з адказам доўга, бо ня ведаю колькі яшчэ пражыву. Я ж меў ужо два інфаркты.

З твайго сэрца (з прапановы) вельмі рады, скарыстаю. Хачу ў яго праліць усю сваю любоў да роднае песьні, мовы, Радзімы, каб яны жылі там і тады, калі мяне ня будзе. Помніш Маршака (Шэкспір – санеты): “Ты погрусти, когда умрет поэт…”? І Бернса ён (Маршак) перавёў цудоўна.

А дзякаваць мушу я Табе, што мне прыблізіла Радзіму. І дасылаць мне нічога ня трэба. Ведаеш, як сьціпла жыву, дык і ўсё маю. Лепш пішы, калі час дазволіць.

Будзьце ж вы ўсе здаровенькія. Не забывайце, калі зможаце.

Сардэчныя прывітаньні Тваёй сямейцы і супольным знаёмым.

З любоўю дзядзька Міхась З.

*Прага, 18. 11. 1971.*

Дарагая Надзейка!

Дзякуй Табе за паэтычныя радкі, за мілыя ўспаміны. І я ня раз затрымліваюся думкамі на мінулым. Шкада, што яго ня вернеш, як ня вернеш маладосьці. А можа гэта і лепш, бо не было б месца для маладых.

З песьняй я не растаюся. Душа іх патрабуе – то сумных, то вясёлых. У галаве заўсёды нейкія мелодыі. Песьні ж сталіся маёю моваю. Шкада толькі, што няма дзе іх сьпяваць. Сьпяваю, каб адвесьці душу, ды для тых, каго ўспамінаю, хоць яны і не пачуюць.

Трэцяга г/м паслаў Табе апошнюю сваю пласьцінку. Ня ўсё Табе будзе там падабацца. Ёсьць песьні вельмі блізкія да фальклёру, але ёсьць і больш самастойныя, розных стыляў і розных настрояў. З таго, што меў, выбраў лепшае на сёньняшні і заўтрашні дзень. Калі сьпевакі ня будуць выконваць таго, што пішуць кампазітары, дык апошнія і кампанаваць ня будуць. На сваём мастацкім падарожжы па Беларусі ў 1963 годзе мне ня раз давялося чуць па канцэрце: "Цікава, што мы тут гэтых песень і ня чулі, хоць яны напісаныя нашымі савецкімі кампазітарамі..." Зразумела, што самі ноты маўчаць, ляжаць, як мёртвыя. Ажывіць іх, змусіць загаварыць, можа толькі сапраўдны мастак, і то пасьля доўгае працы. "Фанатык", як ты калісьці казала. Дык калі табе нешта не спадабаецца адразу, можа спадабацца пазьней.

Плітку тут высылалі ў радыё. Мела добрую адозву ў слухачоў. Чуў яе і з Нямеччыны. Ці высылалі ў Менск – ня ведаю. Паспрабуйце зацікавіць дырэктара праграмы. З 17 песень могуць нешта выбраць, што будзе ім падабацца.

Нядаўна быў у Празе М. Танк са сваім маскоўскім сябрам. Слухалі некалькі гадзін мае песьні. Захапляліся.

Пакойчык мой такі ж, як і быў раней, толькі трохі прыгажэйшы, бо яго малявалі. Затое я нічога не магу знайсьці, бо ня ведаю, што куды паклалі.

Адчуваю сябе горш. Восень, мокра, вецер, холад. Чакаю вясны! І дачакаюся, калі не памру раней.

Пішаш, што Табе прыкра ад таго, што нічога не прашу. Я ж прашу вельмі многа: куточак у сэрцах сваіх суайчыньнікаў. Больш пакуль што мне нічога ня трэба.

Віншую з 50-годдзем унівэрсітэта. Хай жыве і расьсявае веду і культуру на радасьць і шчасьце ўсяго чалавецтва!

Шлю сардэчныя прывітаньні і найлепшыя пажаданьні Табе з сям'ёй і супольным знаёмым (калі такія яшчэ ёсьць!)

Цалую. Твой дзядзька Міхась Забэйда.

*P.S.* Не забывай!

*Прага, 7. 1. 1973.*

Дарагая Надзейка!

Вялікі дзякуй за пажаданьне добрага здароўя. Яго я найбольш патрабую. Пад Новы год ляжаў з гарачкай амаль 39°, пульс – 110-120, няроўны. І кожныя паўгадзіны і ўдзень, і ўночы мусіў хадзіць, ці, лепш кажучы, бегаць туды, куды і кароль пяшком ходзіць. Два дні амаль нічога ня еў. Думаў, прыйшоў канец. Моцна аслабеў, але, здаецца, яшчэ пажыву. Пачынаю выходзіць і набліжацца да нармальнага жыцьця. Памагло тваё шчырае пажаданьне здароўя. (Гэта не іронія!) Я веру ў перадачу (дзеяньне) добрае волі добрых людзей. Як чульлівы, аж перачулены, адчуваю моцна і злую волю злых людзей. А такіх, на вялікі жаль, ёсьць яшчэ на сьвеце многа. Таму добрыя людзі мусяць быць актыўнейшымі ў перадачы свае добрае волі.

Сваім папярэднім пісьмом я зусім не хацеў цябе засмуціць. Былі ж і ў мяне сьветлыя, нават радасныя хвіліны, калі перада мною была надзея зрабіць нешта большае, лепшае для Радзімы, для людзей наогул, калі мяне за мае песьні нават на руках насілі. Але ўсё праходзіць, усё мяняецца, усёканчаецца, як сказаў Геракліт. Дужэйшы пераможа слабейшага, такі закон прыроды. Ды будзе ўжо пра гэта. Лепш

пра нешта весялейшае, хаця б пра тое, што пад Новы год мяне ўспомніла шмат людзей, пра якіх я думаў, што ўжо пра мяне забыліся. Гэта чалавека радуе. Суайчыньнікаў маіх можа парадуе той факт, што мае-нашы песьні сьпяваюць ужо ў канцэртах і мае вучні. Праўда, гэтыя вучні яшчэ да мяне закончылі кансерваторыю і да мяне ходзяць удасканальвацца, хоць самі ўжо вучаць сьпяваць у музычных школах, тым больш гэта гаворыць, як цэняць маю працу (зразумела, ня ўсе!..)

Радасна і тое, што і ў гэтым годзе я атрымаў ад Чэшскага музычнага фонду ўзнагароду-прэмію за сістэматычнае і каштоўнае (мастацкае) выкананьне песень сучасных чэшскіх кампазітараў. Гэта ўжо 13-я ўзнагарода-прэмія, ну, і падзяка, зразумела. А калі ўзяць пад увагу, што тое на 73-м годзе жыцьця, то трэба згадзіцца, што гэта ня часта бывае нават і не ў беларусаў. І хоць гэтага мае суайчыньнікі і ня ведаюць, але мне пісала адна сяброўка, што дала сабе клятву, каб пра ўсё добрае, што датычыць мяне, мае суайчыньнікі даведаліся… Як бачыш, дарагая Надзейка, і цяпер яшчэ жыцьцё маё небезнадзейнае. Дык не сумуй!!! Выхоўвай свайго Васілька, каб ён вырас добрым чалавекам, як выхоўвала і мяне мая матулька, на памяць якое я сьпяваю ў сваіх канцэртах як калыханку…

Будзь здаровенькая, і хай гэты год прынясе Табе і Тваім блізкім зьдзяйсьненьня ўсіх жаданьняў. Цалую. М. Забэйда.

*P.S.* Да таго аптымістычнага, што напісаў, мо і плітка якая захаваецца!..

*Прага, 26.1.1977.*

Добры дзень, дарагая Надзейка!

Шчыра дзякую за навагоднія добрыя словы. Прыемна, што яшчэ не забылася пра дзядзьку Міхася, хоць, праўду кажучы, ён стаў ужо дзедам. І ня дзіва: жыве семдзесят сёмы год на божым сьвеце. А ці яшчэ доўга працягне, невядома.

Хваробаў м*а*ю ўсё больш і больш, а сілы ўсё меней. Ледзьве даходжу да сталоўкі. Лякарствамі завалены пакой, у якім жыву і працую, а здароўя не прыбывае. Нават на канцэрты ці ў тэатр не хаджу. Часта слухаю радыё. У Празе многа выдаюць рускую і савецкую музыку і літаратурныя творы. Часамі перадаюць Быкава ці Танка, зразумела, у перакладзе на чэшскую мову.

Цяпер чытаю вельмі цікавую кнігу В. Рагойшы і яго жонкі “Карані дружбы”. Кніга добра напісана. Шкада, што доўга чытаць не магу, – баляць вочы.

І пісаць доўга не магу, пачынае ўсё балець: сэрца, галава, ногі. Рукі…

Але на здаюся і дагэтуль “разводжу сад”. Даю лекцыі сьпеву. Перадаю сваё мастацтва маладым. Некаторыя з іх пяюць і нашы песьні. Шкада, што Твой Васілёк далёка. Навучыў бы яго ня толькі слухаць, але і пяяць пра камара і муху. Пакуль што пасылаю яму здымак у сваёй працоўні.

Пакуль плітка яшчэ не сапсавана, перайграй яе на магнітафонную стужку, бо і тут гэтых плітак ужо няма.

Прага вельмі зьмянілася: расьце, будуецца метро. Пра надвор’е пісаць ня буду: яно пераменнае, як і ўсюды. Канчаю найлепшымі пажаданьнямі Табе з сям’ёй і супольным знаёмым, калі выпадкам такія знойдуцца.

Між іншым, у мяне знайшоўся стрыечны пляменьнік у Маскве. Кліча ў госьці, але я на такое падарожжа ўжо ня маю сілы. Шкода!..

Будзьце здаровы і шчасьлівы!

Дзед Міхась Забэйда.